БЕЛАРУС

Выдае Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне у ЗША
Published by Byelorussian - American Association. Inc.
Address — Адрыс: Byelorussian-American Association. Inc.
385 Alabama Ave, Apt. 17, Brooklin 7, New York, U. S. A.
Падпіска на год $ 2.50 — Subscription per year — $ 2.50
Рэдагуе Рэдакцыйная Калегія

PRICE 10 ¢ ЧАСАПІС БЕЛАРУСАУ У АМЭРЫЦЫ BYELARUS — WHITERUTHENIAN (BYELORUSSIAN) NEWSPAPER IN THE USA 10 ЦЭНТАЎ

Год V. № 23 (47) 6 Сакавіка 1954 г. NEW YORK, N. Y., U. S. A. March 6, 1954 Vol. V. № 23 (47)

Беларускія перадачы у Радыё „Вызваленьне"

Неўзабаве, за які месяц з амэрыканскае Радыястанцыі „Вызваленьне" (LIBERATION) пачнуцца беларускія перадачы. Бясспрэчна, вестка гэтая будзе ўспрынята беларускай эміграцыяй зь вялікай радасьцяй. А зь яшчэ большаю хіба радасьцяй прывітаюць яе беларусы на Бацькаўшчыне, якім якраз згаданыя радыёперадачы й прысьвечаныя.

Вольнага голасу з вольнага сьвету, праўдзівай інфармацыі аб падзеях у сьвеце з асьветленьнем нашага беларускага жыцьця, нашы праблемаў у роднай беларускай мове — беларускае грамадзтва як на чужыне, гэтак і на Бацькаўшчыне чакала даўно. Часіна гэтая нарэшце надыйшла. Доўгагадовыя жаданьні й змаганне палітычных беларускіх дзеячаў на эміграцыі — мець свае беларускія радыёперадачы нарэшце зьдзейсьніваецца.

Нарэшце й беларусы атрымоўваюць магчымасьць мець свае штодзённыя аўдыцыі — а беларуская палітычная эміграцыя нагоду падаць свой голас разлучаным із намі зялезнай заслонай нашым братом на Бацькаўшчыне. Няма сумлеву, што ў дзень адкрыцьця беларускіх перадачаў — у часіну, калі нашыя паняволеныя браты у далёкім родным Краю, таптаныя бальшавіцкім захопнікам і атуманьваныя нахабнай бальшавіцкай маной, пачуюць наш голас, — сэрцы іхныя страпянуцца не абы-якой радасьцяй. Яны даведаюцца, што тут, за межамі нашага забранага краю, нехта жыве, нехта турбуецца за іхны лёс, выступае ў іхнай абароне. Яны даведаюцца, што жывуць тутка іхныя, столькі мо ўжо раз аплаканыя сыны, браты ці бацькі, а галоўнае, што ўсе мы тут ня толькі на іх не забыліся, што мы працягваем змаганне з бальшавіцкай тыраніяй за вызваленьне нашай любай, незапомнай Бацькаўшчыны-Беларусі, але й тое, што мы не адны, што мы маем пашану й спачуцьці вольнага дэмакратычнага сьвету, а ў тым ліку зразуменьне найвялікшай ды найстрашнейшай нашым ворагам, нашым паняволнікам — дэмакратыі амэрыканскай.

Няма таксама сумлеву, што ў маскоўскіх тыранаў, калі яны пачуюць наш голас адгэтуль, прабягуць па скуры дрыжыкі й яны будуць намагацца каб гэты наш голас не дайшоў да вушэй беларускага народу. Але гэта ім **ня ўдасца.** Мы ў гэтым сяньня **цалкам пэўныя.**

Амэрыканская інфармацыйная служба дакладна пераканалася, што голас радыёстанцыі „Вызваленьне", надаваны ўжо напрацягу нейкага часу іншым народам СССР, **да іх даходзіць.** Тымбалей ёсьць пэўнасьць, што голас гэты трапіць на Беларусь, дзякуючы шэрагу адмыслова спрыяльных для нас абставінаў.

Таму няма дзіву, што бальшавіцкія агенты й іхныя спадарожнікі ды розныя іншыя ворагі беларускага вызвольнага руху, намагаліся ўсялякімі спосабамі не дапусьціць беларусаў да голасу ў амэрыканскіх радыёстанцыях, а калі гэта ім усё-ткі не ўдалося, яны прабавалі прынамся захапіць кіраўніцтва беларускімі перадачамі ў свае рукі. Аднак, амэрыканскія дзеячы, якія кіруюць Радыёстанцыяй „Вызваленьне", на пару пазналіся на гэтай акцыі нашых ворагаў і беларуская сэкцыя Радыёстанцыі „Вызваленьне" абсаджаная цяпер нашымі пэўнымі людзьмі. Дырэктарам беларускіх перадачаў прызначаны вядомы, адзін з старэйшых нашых грамадзкіх і культурных дзеячоў, праф. др. Жук, ведамы нашаму грамадзтву ня толькі ў эміграцыі, але й на Бацькаўшчыне, як непахісны дэмакрат і нястомны змагар за волю беларускага народу.

Беларуская эміграцыя, успрыймаючы гэтую радасную вестку, павінна памятаць свае намаганьні, каб дапамагчы ў працы дырэкцыі беларускіх перадачаў. Беларуская інтэлігенцыя, палітыкі, навукоўцы, актыў беларускіх грамадзкіх арганізацыяў — павінны ўзяць чынны ўдзел у засыланьні дырэкцыі беларускіх перадачаў артыкулаў, матар'ялаў.

Радыястанцыя „Вызваленьне" адчыняе шырокія магчымасьці й дзеля ўсебаковае інфармацыі. Беларускае сьвятарства мае нагоду забраць голас у абароне перасьледванай бальшавікамі царквы, выступіць із сваім моцным словам супраць зьдзеку бязбожнікаў над веруючым беларускім народам. Эканамістыя павінны дэмаскаваць барбарскую бальшавіцкую эксплятацыю беларускіх працоўных масаў і паказваць ім праўдзівы шлях нармальнага людзкога гаспадарчага й сацыяльнага разьвіцьця, заместа цынічных насьміханьняў над працоўным народам ды ўгаварваньня яму байкаў аб „шчасьлівым і радасным жыцьці" ды ўдачах і перамогах бальшавіцкага сацыялізму.

Гісторыкі, пісьменьнікі, паэты, музыкі — кажны ў сваёй галіне — патрапяць таксама займець у нашых радыяперадачах свой голас, слова, накіраванае да сваіх нявольнікаў-сяброў.

Актыў беларускіх грамадзкіх арганізацыяў, раскіданых па ўсім сьвеце, павінен штодзённа, пільна зьбіраць і перасылаць дырэкцыі беларускіх перадачаў весткі-хроніку аб жыцьці й працы сваіх арганізацыяў.

Беларускія перадачы ў Радыё „Вызваленьне" — гэта наша **першая штодзённая „газэта",** газэта вольнага слова, „чытаць" якую не перашкодзяць беларускаму народу нат бальшавіцкія тыраны. Разам із ім, перадачаў гэтых будуць слухаць і тысячы чужынцаў на ўсім сьвеце, якія сочаць за намі й цікавяцца нашым вызвольным рухам.

Дзеля усяго прыгаданага, нашыя радыёперадачы павінны быць пастаўленыя на належнай вышыні. Яны павінны поўнасьцяй адлюстроўваць нашае як грамадзка-палітычнае, гэтак і культурнае жыцьцё на чужыне ды выяўляць усю ману бальшавіцкае прапаганды і ўвесь зьдзек чырвонага панявольніка над беларускім народам.

Паставіць-жа на належнай вышыні нашыя перадачы, а гэтым самым і накіраваць лязо нашае зброі супраць нашых прыгнятальнікаў мы патрапім без асаблівых цяжкасьцяў, калі ўсе станем да працы й актыўнага супрацоўніцтва з дырэкцыяй нашых радыёперадачаў.

Мы перакананыя, што беларускае грамадзтва на эміграцыі належна ацэніць здабытыя намі цаною даўгога змаганьня магчымасьці й на гэтых новых, запраўды важных выходных пазыцыях, заданьні свае перад беларускім народам годна выканае.

М. Відук.

„Спадчына"

Вялікае эміграцыйнае выданьне твораў ЯНКІ КУПАЛЫ.

— „Кажны народ мае свае вялікія нацыянальныя вартасьці, сваіх найвялікшых людзей ды іхную творчасьць, зь якой чэрпае нязьнішчальную жыцьцёвую моц, на якой узгадоўваюцца цэлыя пакаленьні й якой ён ганарыцца перад сьветам", піша газэта „Бацькаўшчына" ад 17-га студзеня 1954 г. абвяшчаючы сваім чытачом аб выхадзе неўзабаве ў сьвет вялікага зборніку твораў нашага няўміручага нацыянальнага прарока й волата беларускага слова Янкі Купалы.

І запраўды, гэта падзея ў культурным жыцьці нашае эміграцыі не малая. Уся творчасьць Купалы наагул ня шмат каму ведамая, а сяньня на эміграцыі дзень па дні забываюцца намі й тыя ягоныя творы, якія заклікалі на змаганьне за будучыню нашае старэйшае пакаленьне яшчэ дзясяткі год таму.

А тымчасам творчасьць Купалы — гэта вялізарны нацыянальны скарб, якім мы зусім справядліва можам ганарыцца перад іншымі й глыбака успрыймаць самі, чэрпаючы зь яго духовую моц у гэтак частыя й непазьбеглыя на выгнаньні часіны сумляваньняў і зьнясіленьня ды той нязгаслы вагонь, які, дарма што ўсе няўдачы, перашкоды, цяжкасьці й спакусы не даюць бальшыні з нас сыйсьці з камяністае жыцьцёвае сьцежкі змагароў за Бацькаўшчыну на шмат выгаднейшы й шырэйшы гасьцінец асабістых выгодаў ды ўдачаў.

Купала сяньня, на эміграцыі, — гэта нашае грамадзкае й нацыянальнае сумленьне, якое жыве й будзе жыць нат „сярод маны, сярод насьмешкаў", аж ня зьдзейсьніцца тое, дзеля чаго жывем мы й дзеля чаго памёр Купала — дзень вызваленьня нашае Бацькаўшчыны.

Думка выдаць вялікі, прыгожы, навукова апрацаваны зборнік твораў Купалы паўстала тут, на эміграцыі ужо колькі год таму. Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва паставіў быў гэтую справу сваёй першай мэтай. Блізу зь першых-жа дзён заіснаваньня Інстытуту, захопленыя гэтай думкай ягоныя сябры пачалі шукаць шляхі зьдзейсьненьня задуманае імі вялікае справы. Пачалася падрыхтавальная праца, вышукваньне Купалавых твораў па амэрыканскіх бібліятэках і ў прыватных асобаў, захады перад амэрыканскімі арганізацыямі дзеля атрыманьня хоць сьціплае грашовае дапамогі, якая-б дала магчымасьць прынамся пачаць справу. Але, на жаль, ні адна з гэтых арганізацыяў, што выкідаюць дзясяткі тысячаў даляраў на перадрук зборнікаў вершаў гэткіх, прыкладам, расейскіх паэтаў, як Ахматава, грошы дзеля выданьня твораў нашага нацыянальнага песьняра-прарока, ахвяры бальшавіцкага нялюдзкага прыгнёту, не знайшла. Таму, калі зборнік быў ужо тэхнічна падрыхтаваны адмысловай камісіяй, складзенай з сяброў Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, давялося шукаць іншых шляхоў ды іншае дапамогі. І яны знайшліся.

Спадзяючыся на падтрыманьне беларускае эміграцыі з усяго сьвету, Выдавецтва газэты „Бацькаўшчына", зацягнуўшы пазыку, узяла на сябе адказнае заданьне — прыгожа, як належыцца памяці нашага нацыянальнага песьняра, выдаць вялікі том твораў Янкі Купалы. Зборнік гэты мае ахапіць усе найлепшыя й найбольш характарныя творы паэты, прадмову, біяграфію песьняра й колькі здымкаў: аснаўны партрэт Купалы з пэрыяду „Шляхам жыцьця", Купалу ў маладых гадох, Купалу з часаў спробы самагубства ў 1930 г., Купалу ў апошніх гадох жыцьця, хату ў якой нарадзіўся Купала, аўтографы ягоных вершаў і г. д.

Зьмест зборніку падзелены на гэткія разьдзелы:

1. **Наша вёска** — першыя вясковыя, сялянскія песьні маладога паэты, якія, аднак, канчаюцца ужо гэткім вершам, як „А хто там ідзе".
2. **Па межах родных** — вершы аб беларускай прыродзе, аб беларускіх вёснах, летках і восенях.
3. **Забраны Край** — вершы ў якіх паказаная трагічная доля Забранага Краю-Беларусі й цяжкая нядоля паняволенага чужынцамі беларускага народу.
4. **Ужо днее** — вершы, поўныя надзеі й веры ў лепшую долю Бацькаўшчыны.

канец на 2-ой бал.

БАПЦ непакоіць Маскву

Камуністычныя газэты расейскай эміграцыі ў канцы 1953 г. надрукавалі „зварот да веруючых беларусоў за рубяжом" нейкага Пітырыма зь Менску, які мянуе сябе „архіяпіскапам Менскім і Беларускім".

Зварот накіраваны супроць Беларускай Праваслаўнай Аўтакефальнай Царквы й самога права беларускага народу на сваю незалежную Царкву. Беларуская эміграцыя заклікаецца ў ім прызнаць устаноўленага бязбожным бальшавіцкім рэжымам расейскага маскоўскага патрыярху ды ягонага стаўленіка ў Менску архіяпіскапа Пітырыма.

Ведаючы, якая „свабода" наагул, а рэлігійная асабліва, існуе ў БССР, можна напэўна сказаць, што зварот Пітырыма ня ёсьць запраўды нейкім свабодным галасам „архіяпіскапа Менскага й Беларускага". Наадварот. Калі гэты ліст зьявіўся адразу ўва ўсіх эміграцыйных камуністычных расейскіх газэтах, дык гэта зусім пэўная азнака таго, што ён пісаны з загаду й нават пад дыктоўку бальшавіцкага палітбюра й у першую чаргу ёсьць палітычна-прапагандным ходам **бальшавіцкай партыі,** а ня нейкага бязвольнага Пітырыма.

Із зьместу звароту відаць, што бальшавіцкую Маскву вельмі трывожыць факт існаваньня й дзейнасьці на эміграцыі Беларускай Праваслаўнай Аўтакефальнай Царквы, самы назоў якой, як гаворыцца ў звароце бясспрэчна падабаецца на[illegible] да сябе шмат каго„. Дык вось выступленьнем Пітырыма бальшавікі намагаюцца падважыць сярод праваслаўнай беларускай эміграцыі давер да гэтай Царквы ды прабуе даводзіць, што толькі арх. Пітырым у Менску пад юрысдыкцыяй маскоўскага патрыярхі мае права рэпрэзэнтаваць Беларускую Праваслаўную Царкву.

Пітырым прызнае, што пасьля Сабору ў Менску ў 1942 г. БАПЦ у выніку ваенных падзеяў існавала дэ факто, хоць і ня была яшчэ прызнаная іншымі цэрквамі дэ юрэ (аб такое прызнаньне расейскі япіскапат БАПЦ, варожы аўтакефаліі прынцыпова, да іншых цэркваў і ня зьвяртаўся). Але ён пярэчыць праву на існаваньне БАПЦ цяпер, калі бальшавікі ізноў акупавалі Беларусь ды ўстанавілі там сваю герархію, падпарадкаваную Маскве.

Пітырым кажа, што ў паўстаньні БАПЦ „вінаватая" сямперш беларуская нацыянальная інтэлігенцыя, сярод якой якраз было імкненьне тварыць сваю, незалежную ад Масквы, царкву. Пералічае ён і некаторыя прозьвішчы гэтай „вінаватай" інтэлігенцыі, а між імі падае й прозьвішча ведамага Р. Астроўскага. Што да апошняга, дык інфармацыя Пітырыма недакладная, а й дакараць яму за „грэх" аўтакефаліі справа непатрэбная і лішняя. У справе скліканьня Сабору ў Менску ды апавешчаньня БАПЦ Астроўскі ня меў ніякае паважнейшае ролі а на эміграцыі ён даўно выракся разам з расейскай герархіяй і самой БАПЦ ды перайшоў цалком на пазыцыі Пітырыма, ягоных чырвоных гаспадароў, ды расейскіх маскоўскай і зарубежнай цэркваў у бясплодным намаганьні зьнішчыць Беларускую Царкву, як самастойную арганізацыйную адзінку на чужыне, а таксама як носьбітку ідэі незалежнай Беларускай Праваслаўнай Царквы й некалі на вольнай радзіме.

Трэба ведаць, што справа незалежнасьці Беларускай Царквы ня нейкая ў запраўднасьці „выдумка" сучаснай беларускай інтэлігенцыі. Пачаткі яе сягаюць аж XIII ст., калі была закладзеная незалежная мэтраполія ў Наваградку мэтрапалітаю Тэафілем у 1291 г. Пазьней яна існавала стагодзь-

СУРОДЗІЧЫ-БЕЛАРУСЫ !

25-га САКАВІКА 1954 ГОДУ прыпадаюць **36-ыя ЎГОДКІ АБВЕШЧАНЬНЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ**

ДЗЕНЬ 25 САКАВІКА

Як у мінулыя гады, гэтак і сёлета усё беларускае грамадзтва павінна належна адзначыць гэтую найвялікшую падзею ў гісторыі нашага народу, пасьветчыць перад сьветам сваім удзелам у ладжаных урачыстасьцях нашую адданасьць сьвятой Сакавіковай ідэі — **Незалежнасьці нашае Беларускае Дзяржавы,** за якую змагаўся, змагаецца й будзе змагацца наш народ, аж да перамогі.

Беларускае грамадзтва ў Нью-Ёрку вылучыла сёлета адмысловы Грамадзкі Камітэт, які й ладзіць сьвяткаваньне нашага

ДНЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ

У НЯДЗЕЛЮ 28-га САКАВІКА 1954 Г.

Сёлетняе сьвяткаваньне Сакавіковых Угодкаў пачнецца а гадз. 10-ай раніцы Службай Божай у Царкве Сьв. Тройцы (345 E., 4-ая вуліца ў Нью-Ёрку), адпраўленай Яго Прэасьвяшчэнствам Япіскапам БАПЦарквы Уладыкам Васілём.

А гадзіне-ж 3-яй папаўдні ў вялікай залі Ірвінг Гай Скул, 40 Ірвінг Плэйс, рог 16 вуліцы ў Нью-Ёрку адбудзецца

Сьвяточная Акадэмія,

на якую запрашаюцца ўсе беларускія арганізацыі і ўсе беларусы з Нью-Ёрку й ваколіцы.

Грамадзкі Камітэт
Сьвяткаваньня 25-га Сакавіка
у Нью-Ёрку.

БАПЦ непакоіць Маскву

(Канец)

дзямі і, хоць часова й заняпадала, але сама ідэя ніколі ня гінула. Апошні раз перад саборам у Менску ў 1942 г., — спроба аднавіць беларускую незалежную Царкву была зробленая ў 1922 г. мэтрапалітаю Мэльхізэдэкам.

Чырвоная (як і чорнасоценная) Масква добра разумее, што вынесеная вернікамі й сьвятарамі на выгнаньне БАПЦ ёсьць і будзе сталым, нягаснучым сьветачам праваслаўнай Хрыстовай веры сярод беларускай эміграцыі, сымбалем роўнага перад Богам права й беларускага народу на сваю царкоўную арганізацыю ды на беспасярэднюю сувязь з цэнтрам духовым усяго праваслаўя ў Канстантынопалі бяз прымусовага манапольнага пасярэдніцтва Масквы.

Вось таму й выданы ды апублікаваны ў камуністычных газэтах і доўгі „зварот" які намагаецца давесьці, што такая Царква ня ёсьць на карысьць беларускага народу, ды што „адзіны", „правільны", „кананічны" ды наагул магчымы шлях для праваслаўных беларусоў, гэта заставацца ў вечнай і поўнай залежнасьці ад Масквы ды устаноўленай бальшавікамі маскоўскай патрыярхіі.

Які адказ дасьць беларуская праваслаўная эміграцыя Пітырыму й ягоным бязбожным гаспадаром — сумлеву хіба няма. Кажны з нас з жахам ўспамінае й ніколі незабудзе таго жудаснага факту, што ўжо перад пачаткам апошняй вайны на ўсёй прасторы БССР не засталося ніводнага сьвятара, які-б легальна выконваў свае духоўныя абавязкі, ніводнай дзейнай праваслаўнай царквы. Усе цэрквы былі або збураныя, або аберненыя злачыннымі рукамі ў склады, хлявы, кінатэатры.

Беларускі эмігрант таксама вельмі добра ведае, на чым гэта сумленьні ляжыць злачын вынішчэньня каля дзесяці тысяч праваслаўных сьвятароў ды дзесяткоў царкоўных герархаў на чале з мучанікам за незалежную Беларускую Царкву мэтрапалітам менскім Мэльхізэдэкам. Мы таксама ведаем, хто вінаваты за сотні тысяч замучаных і сасланых вернікаў, якія выступілі ў абароне сваіх сьвятароў, сьвятыняў і сваёй праваслаўнай веры.

І вось гэтыя злачынныя народагубцы маюць яшчэ сяньня крывадушную сьмеласьць выступаць у справах і ад імя Беларускай Праваслаўнай Царквы ці то самі, ці то праз сваіх падстаўленых нявольнікаў — Пітырымаў, ды сьвятагубна адважвацца й на зьнішчэньне БАПЦ на эміграцыі.

Кажнаму ясна, што крывёю мучанікаў за веру спляміленыя рукі ня маюць ніякога права дакранацца да сьвятых беларускаму сэрцу царкоўных справаў ды да рэлігійных пачуцьцяў беларускага народу ні на радзіме, ні на эміграцыі. Крывадушныя бальшавіцкія „клопаты" аб „дабро" Беларускай Царквы, гэта нішто іншае, як воўчыя хвальшывыя сьлёзы катаў-нішчыцеляў як праваслаўнай, гэтак і ўсіх іншых вераў на прасторах ўсіх народаў СССР.

І таму ўсе бальшавіцкія заклікі-звароты дарэмныя. Зьнішчыць БАПЦ ды падпарадкаваць сваёй хвальшывай царкве вольную беларускую эміграцыя ім ня ўдасца.

Свабода й супакой праз вызваленьне

У апошніх днёх студзеня ў Вашынгтоне ізноў адбылося паседжаньне-зьезд г. зв. „Канфэрэнцыі свабоды й супакою праз вызваленьне", скліканы сп. Армстронгам, старшынёю Цантральнага Камітэту Канфэрэнцыі. Мэтай гэтага зьезду было дакладнае абмяркаваньне рэзалюцыі, прынятай на апошняй канфэрэнцыі ў пачатках сьнежня мінулага году й падзел паасобных функцыяў паміж рознымі камітэтамі, якія й былі гэтым разам пакліканыя да працы.

Кангрэсмэн Армстронг паінфармаваў самперш прысутных аб далейшых плянах узначальваньня й працягваньня канцэпцыяў вызваленьня. Ён сказаў, што сябры Кангрэсу Кэрстэн і Фэйен, як і сэнатар Мундт, зьмясьцілі ў кангрэсавым бюлетэні й рэзалюцыю папярэдняе Канфэрэнцыі й тэкст важнейшых прамоваў ейных удзельнікаў. Цяпер, — дадаў ён, — перад Камітетам стаіць заданьне здабыць належныя фонды, каб мець магчымасьць пашырыць і памацніць ягоную дзейнасьць. У рамах гэткага пашырэньня дзейнасьці Камітэту прадугледжаныя, між іншага, й шырокая прапаганда ў прэсе, радыё й TV, звароты да амэрыканскага грамадзтва й заклікі матар'яльна падтрымаць працу арганізацыі.

Зьезд мінуў у мілым і спакойным настроі. Удзельнічалі ў ім усе выдатнейшыя прадстаўнікі амэрыканскае палітыкі й шмат эміграцыйных палітыкаў — уцекачоў з паняволеных Саветамі краінаў. Ад Беларускага-Амэрыканскага Задзіночаньня выступала на Канфэрэнцыі сп-чна В. Жызьнеўская, якая брала голас у дыскусіях, належна насьвятляючы нашыя беларускія пазыцыі.

КАНФЭРЭНЦЫЯ, ПРЫСЬВЕЧАНАЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ НАВУКІ.

3-га й 4-га красавіка сёлета, у новым, кагадзе пабудаваным будынку на Пляцы Задзіночаных Нацыяў і 46-ай вуліцы мае адбыцца навуковая канфэрэнцыя, прысьвечаная свабодзе навукі й навукоўцаў у Савецкім Саюзе. Канфэрэнцыя гэтае мае сваёй мэтай разьвеяць пераканаьне шмат каго з жыхароў ЗША й Захаду наагул, пераканаьне, накіданае напрацягу даўгіх год вольнаму сьвету бальшавіцкай прапагандай, быццам свабода й незалежнасьць навукі ня толькі ня зьнішчаныя ў Савецкім Саюзе, але што, наадварот, незалежная навуковая думка мае тамака й дапамогу й падтрыманьне. Манліваcьць гэткае савецкае прапаганды сталася якраз прычынаю й другое мэты плянаванае канфэрэнцыі, гэта — намаганьню давесьці, што гэтак выслаўляная камуністамі свабода іхнае навукі ня можа наагул існаваць, бо незалежная навука адразу-б выявіла ўсю хвальшывасьць камуністычных тэорыяў, або станоўка зганьбіла мэтады, якія ўжываюць у сваёй практыцы камуністы з пад чырвоных зораў Крамля ці іхныя сябры ў сьвеце.

Плян канфэрэнцыі прадугледжвае тры паасобныя паседжаньні, якія маюць адбыцца напрацягу двух дзён. У канфэрэнцыі маюць узяць удзел навукоўцы-эмігранты з СССР, а таксама й выдатнейшыя амэрыканскія навуковыя сілы. Кошты канфэрэнцыі ўзяў на сябе ведамы ўжо нашаму грамадзтву Мюнхэнскі Інстытут Вывучэньня Гісторыі й Культуры СССР, падтрымоўваны ў сваю чаргу Амэрыканскім Камітэтам Вызбаленьня ад Бальшавізму.

Справаздача з канфэрэнцыі мае быць пераданая Радыёстанцыяй „Вызваленьне" на розных мовах у Савецкі Саюз.

СЛУХАЙЦЕ БЕЛАРУСКІЯ ПЕРАДАЧЫ З ВАТЫКАНУ

Паведамляем нашых суродзічаў у ЗША, што Ватыканскае Радыё пачало надаваць два разы ў тыдзень беларускія перадачы. Перадачы гэтыя, надаваныя на кароткіх і сярэдніх хвалях, можна добра слухаць і тут, у нас. Надаюцца яны кажнае серады й пятніцы а гадз. 18:15 паводле рымскага часу (у Нью-Ёрку на 6 гадз. пазьней) на хвалях (кароткіх): 49,75 (4 М); 41,21; 31,10 (Т); 25,67; і на сярэдніх хвалях 196.

„СПАДЧЫНА"

5. **На сход** — Наймацнейшыя, натхнёныя, прарочыя вершы-заклікі паэты, закончаныя магутнай просьбай-малітваю „Паўстань з народу нашага прарок".
6. **Сваім і чужым** — вершы-звароты да сваіх і чужых.
7. **Безназоўнае** — вершы з пары, калі прарочыя словы паэты пазналі ўжо былі бальшавіцкую цэнзуру.
8. **Шляхам гадоў** — сьцяг вершаў, пісаных напрацягу ўсяго жыцьця паэты, дзе ён выказвае пагляд на сваю ролю й заданьні.
9. **Для яе** — вершы, прысьвечаныя каханьню.
10. **Сатыра** — Сатырычныя вершы й байкі Купалы.
11. **Паэмы** — разьдзел, у якім сабраныя гэткія творы паэты, як „Курган", „На куцьцю", „На папасе", „Адвечная песьня" й інш.
12. **„Слова аб палку Ігаравым"** — высока мастацкі перапеў Купалы гераічнае паэмы-эпасу нашага народу з XII стагодзьзя.

Няма сумлеву, што выданьне гэткага вялікага й рэпрэзэнтацыйнага зборніка твораў Янкі Купалы — рэч у нашых эміграцыйных умовах цяжкая й адказная. Таму, усё нашае грамадзтва, у які-б куток сьвету не закінула яго сяньня доля, павінна па меры магчымасьці, перадусім матар'яльна, падтрымаць выдавецтва зборніку, які павінен стацца для кажнага беларуса на чужыне той эвангеляю, зь якой ён будзе чэрпаць духовую моц і веру ў адраджэньне роднага краю, а таксама й незабыўным успамінам аб тым, хто ўжо столькі год таму прарочым сваім натхненьнем зразумеў і глыбака адчуў тую тугу, якая ляжыць сяньня на дне душаў нашых выгнаньнікаў і нашаю, здаецца, жальбою, нашымі словамі каханьня й адданасьці Бацькаўшчыне, напісаў несьмяротныя радкі вершу:

— „Я ад Вас далёка, бацькаўскія гоні,
На чужое неба ўжо гляджу сягоньня,
Але думкай, сэрцам толькі Вас я знаю —
Як і жыў, жыву я ў сваім родным краю"...

———

Як мы даведваемся, зборнікі твораў Я. Купалы маюць выйсьці ў сьвет на добрай звычайнай паперы, на дарагой бліскучай паперы, у папяровай і ў палатнянай вокладках. Цана паасобнага зборніку будзе з гэтае прычыны складаць ад 9 да 12 даляраў.

Грошы на зборнік трэба слаць адмысловаму прадстаўніку Выдавецтва „Бацькаўшчына" ў Бэльгіі сп. Янку Жучку 19, Place Hoover, Louvian, Belgique зазначаючы, што высылаюцца яны на зборнік „Спадчына".

Дык пачнема-ж пашырэньне гэтае дарагое кажнаму беларусу кнігі ўжо сяньня. Калі яна разыйдзецца запраўды па ўсіх кутках сьвету, трапіць у кажную беларускую хату, ейная вялікая мэта — духова палучыць нас із згубленай Бацькаўшчынай, будзе асягненая напэўна.

Рэдакцыя газ. „Беларус".

ПРЭЗЫДЭНТ БНР ІНЖ. АБРАМЧЫК У КЛІЎЛЭНДЗЕ

16-17 студзеня 1954 г. у месьце Кліўлэндзе адбыўся ў прысутнасьці Прэзыдэнта БНР інж. М. Абрамчыка сход Радных БНР з Кліўлэнду, Дэтройту й Калюмбус. На сходзе разважаліся пытаньні з парадку дня 7-ай Сэсіі Рады, якая адбываецца ад лістапада ў Нью-Ёрку.

З прычыны таго, што сябры Рады, якія жывуць у Кліўлэндзе, Дэтройце й Каюлмбусу, дзякуючы вялікай адлегласьці не маглі прыехаць на Сэсію ў Нью-Ёрк, сп. Прэзыдэнт дакладна паінфармаваў іх аб нашым агульным палітычным палажэньні і аб прабегу працы 7-ай Сэсіі Рады. Пасьля дакладу Прэзыдэнта адбылася на працягу 2-х паседжаньняў дыскусія, якая, варта адцеміць, праходзіла ў вельмі сымпатычнай атмасфэры.

У нядзелю 17 студзеня сп. Прэзыдэнт прысутнічаў на Службе Божай у Беларускай Праваслаўнай Царкве Сьвятога й Цудатворнага Абраза Жыровіцкае Божае Маці, а а 5-ай гадз. пап. выступіў із прамоваю на скліканым Аддзелам Задзіночаньня з гэтае нагоды мітынгу беларускае калёніі ў Кліўлэндзе.

Угодкі сьмерці М. РАВЕНСКАГА

У сыботу, 20 сакавіка, з прычыны першых угодкаў перадчаснае сьмерці сьв. пам. кампазытара Міколы Равенскага, Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва, ладзіць Навуковае Паседжаньне, прысьвечанае жыцьцю й творчасьці Нябожчыка, з навуковымі рефэратамі й музычнай ілястрацыяй творчасьці кампазытара у выкананьні сп-ні Э. Зубковіч. Усе беларусы, каму дарагая памяць Міколы Равенскага, запрашаюцца ушанаваць яе сваім прыбыцьцём на паседжаньне.

Навуковае паседжаньне БІНІМ, прысьвечанае першым угодкам сьмерці кампазытара Равенскага адбудзецца ў залі Украінскага Літаратурна - Мастацкага Клюбу (149, 2-ая Эвеню, паміж 9 і 10 вул. у Нью-Ёрку). Пачатак а 7-ай гадз. увечары. Уваход вольны.

ВЫПІСВАЙЦЕ, ЧЫТАЙЦЕ І ПАШЫРАЙЦЕ ГАЗЭТУ **„БЕЛАРУС".**

Змаганьне за беларускі голас у эфіры

Лішнім пэўне было-б даводзіць, якое вялізарнае значаньне мае сяньня ў сьвеце радыё й якая паважная ягоная роля наагул.

Кажны з нас добра сабе таксама ўсьведамляе, дзеля чаго усе дзяржаўныя народы выдаюць сотні мільёнаў, а некаторыя навет мільярды даляраў на пабудову, утрыманьне й абслугу радыёстанцыяў.

Сучаснае міжнароднае палітычнае палажэньне, напружаныя дачыненьні заходня-дэмакратычнага сьвету з маскоўска-бальшавіцкай імпэрыяй — асабліва выразна сьветчаць пра тое, якое значаньне кажны з гэтых няпрымірных фронтаў аддае радыёперадачам і якое месца яны прыдзяляюць ім у сваіх дзяржаўных бюджэтах.

Асабліва шмат каштуе вайна ў эфіры бальшавіком, бо апрача шматлікіх радыёстанцыяў, пабудаваных дзеля ўтрыманьня ў блудзе сваіх паняволеных народаў, яны мусілі яшчэ пабудаваць безьліч шмат даражэйшых станцыяў-глушыльнікаў, каб не дапусьціць да вушэй сваіх грамадзян гэтак страшное кажнаму тырану вольнае слова з захаду. Тысячы навукоўцаў-спэцыялістых як з аднаго, гэтак і з іншага боку, нясупынна працавалі й працуюць над вынаходам апаратаў адны, каб стварыць бар'еры ў эфіры, а іншыя, каб разбурыць іх, адчыніць дарогу вольнаму слову.

Для нас, беларусаў, здабыць месца, для свайго голасу ў эфіры — мела асабліва вялікае значаньне. Гэткае якраз месца, гэткая станцыя, патрэбныя нам, каб голас наш дасягаў, лучыў духова ня толькі нас, рассыпаных сяньня па ўсім вольным сьвеце, але каб ён лучыў нас і з нашымі роднымі братамі на бацькаўшчыне ды мільёнамі паняволеных нашых братоў на ўсёй прасторы бязьмежнай бальшавіцкай імпэрыі — Сібіры ды Паўночных тундрах.

Атрымаць гэткае месца было нам ня лёгка. На нашым шляху змаганьня за вольны беларускі голас у эфіры — знайшлося ня мала перашкодаў. Але нарэшце ўсе яны былі пераможаныя й мы атрымалі магчымасьць займець месца, зь якога неўзабаве залунае беларускі голас, паўстрымаць які ня здолеюць ніякія варожыя сілы й які будзе чутны ў цалюсенькім сьвеце, усюды, дзе толькі жывуць беларусы.

Дасягненьні гэтыя для нас бясспрэчна вялізарныя. Вялікая ў гэтым заслуга й тых нашых палітычных бээнэраўскіх дзейнікаў, якія паклалі столькі намаганьняў ды энэргіі у справе заваёвы нам такіх пазыцыяў.

Варта дзеля гэтага паінфармаваць нашых чытачоў аб прабегу нашага змаганься за беларускі голас у эфіры, аб тым, якія перашкоды нам ставіліся й як выглядае гэтая спарава на сяньня.

———

Першай амэрыканскай станцыяй зь якой пачалі падавацца перадачы ў мовох некаторых паняволеных Масквой народаў яшчэ ў часе 2-ой сьветнай вайны, быў „Голас Амэрыкі". Украінцы, грузіны, армяны, балтыцкія народы пачалі свае перадачы ў „Голасе Амэрыкі" ў 1949-50 гадох, крыху пазьней да іх былі далучаныя мовы некаторых іншых народаў СССР.

Змаганьне беларусаў за перадачы ў „Голасе Амэрыкі" пачаліся ў канцы 1949 г. Атрымаць там месца нам, аднак, не ўдалося, хоць у 1949 г. дырэкцыі „Голасу Амэрыкі" было складзена звыш 60 заяваў ад розных беларускіх арганізацыяў. Складаліся заявы й Міністэрству Замежных Справаў (Department of State). У кажнай зь іх матывавалася патрэба беларускіх радыёперадачаў. Аднак, нягледзячы на ўсе довады беларусаў і шэраг наведаньняў да тагачаснага дырэктара „Голасу Амэрыкі" сп. Колера, самога міністра інфармацыі й розных ягоных памоцнікаў, ніяк не ўдавалася пераканаць вырашальныя ў гэтай справе амэрыканскія дзейнікі ў нашай праўдзе. Доўгагадовая бяссорамная прапаганда расейскіх шавіністых зрабіла была сваё. Расейцам удалося праз розных сваіх „дарадчыкаў" пераканаць амэрыканцаў, што беларускія перадачы зусім непатрэбныя, бо ўсе беларусы разумеюць расейскую ці польскую мовы й таму шкада выкідаць грошы на аўдыцыі беларускія.

Асабліва вялікія перашкоды рабіў беларусам шэф славянскага аддзелу „Голасу Амэрыкі" — ён-жа й найбліжэйшы дарадчык тагачаснага дырэктара Колера, — сп. Бармін. Гэты апошні, будучы кіраўніком усяго славянскага аддзелу, лічыўся, дзякуючы сваёй мінуласьці (б. ген. НКВД), ў Вашынгтоне да таго-ж „спэцам у савецкіх справах".

Толькі ўлетку 1952 г. пры дапамозе асабістае інтэрвэнцыі і сувязяў прэз. Абрамчыка ўдалося нарэшце разьбіць усю хлусьлівую прапаганду супроць беларусаў і здабыць абароньнікаў патрэбы беларускіх перадачаў паміж найбольш уплывовымі амэрыканцамі.

Улетку 1952 г. беларуская мова, у ліку 5-ёх іншых моваў, (швэцкая, дацкая ды інш.) была ўжо улучаная у бюджэт дырэкцыяй „Голасу Амэрыкі" й Дэпартамантам Стэйту, як мова, якую належыць улучыць у перадачы „Голасу Амэрыкі". Прыгэтым было запэўнена, што беларуская мова зь ліку згаданых 5-ёх праэктаваных дзеля новых перадачаў, будзе пастаўленая на першым месцы.

Гэткім чынам, справа беларускіх перадачаў у „Голасе Амэрыкі", здавалася-б, узыйшла была на зусім добры шлях. Ставілася ўжо навет пытаньне аб падборы пэрсаналу для беларускіх перадачаў. Абставіны, аднак, неспадзявана павярнулі йначай. Рэвізія дзейнасьці працы самога кіравецтва — дырэкцыі „Голасу Амэрыкі" адмысловай камісіяй, благія водгукі аб самых перадачах мелі вынікам тое, што заместа плянаванага пашырэньня перадачаў „Голасу Амэрыкі", Вашынгтон пастанавіў скараціць іх. Бюджэт „Голасу Амэрыкі" быў абрэзаны. Заместа дадаваць новыя мовы, дырэкцыя „Голасу Амэрыкі" пачала шукаць магчымасьці вылучыць із сваіх перадачаў некаторыя ўжо надаваныя мовы, што й было зробленае крыху пазьней з перадачамі азэрбайджанцаў, паўночных каўказцаў ды інш.

Радыёперадачы „Голасу Амэрыкі", хоць і былі перабудаваныя, а расейскія ўплывы ў ім падарваныя (ген, Бармін быў з „Голасу Амэрыкі" выкінены) — аднак давялося пагадзіцца з адказам — чакаць, пакуль бюджэт „Голасу Амэрыкі" ня будзе павялічаны ізноў, а калі гэта будзе — ніхто ня можа сказаць.

Другой Амэрыканскай Радыёстанцыяй, якая пачала сваю працу ў 1950-51 годзе, была г. зв. „Вольная Эўропа" (Free Europe), прызначаная адмыслова для народаў Сярэдняе Эўропы Беларусы й украінцы, якія зусім справядліва залічаюць сябе да народаў сярэдняе, цэнтральнае Эўропы, рабілі таксама стараньні атрымаць у Радыё „Вольнай Эўропы" свае перадачы, але й там як нам, гэтак і украінцам станоўка адмовілі даць месца, спасылаючыся на тое, што радыё „Вольная Эўропа", як і ўся палітычная акцыя пад гэтай фірмай, прызначаныя вылучна й толькі для „сатэліцкіх народаў", што знаходзяцца ў „спэцыфічна адменных умовах", раўнуючы да народаў, якія уваходзяць у склад СССР.

Варта гэтта адцеміць таксама аб нашых намаганьнях атрымаць беларускія перадачы ў розных іншых эўрапейскіх радыёстанцыях.

Гэткія намаганьні былі робленыя:
1. Перад Ватыканскім Радыё,
2. Перад дзяржаўным італьянскім радыё,
3. Перад радыё францускім,
4. Перад ангельскім радыё (BBC),
5. Перад радыё гішпанскім.

Трэба зь вялікай прыемнасьцяй адцеміць, што з боку Ватыканскіх уладаў мы адчулі найбольшае ў гэтым сэньсе зразуменьне і, як ведама, беларускія перадачы надаюцца Ватыканскім радыё вось ужо каля трох год. Самперш яны надаваліся раз на тыдзень, а апошнім часам надаюцца два разы на тыдзень па 15 часінаў.

Вельмі ўважліва й прыхільна аднесьліся да нашай просьбы й італьянскія ўлады, але перашкодай займець беларускія перадачы ў італьянскім радыё сталіся чыста матар'яльныя прычыны, якія, аднак, мы усьцяж спадзяемся адолець, не губляючы надзеі ў тое, што беларускія перадачы праз італьянскае радыё усе-ткі некалі пачнуцца.

У францускіх радыёстанцыях нам удавалася мець беларускія радыёперадачы толькі час ад часу (колькіразовае надаваньне беларускіх песьняў, інтэрв'ю а. Гарошкі). На сталае месца ў францускім радыё, на жаль, разьлічаць пакуль што цяжка.

Прыхільна паставіліся да нашых просьбаў і гішпанскія ўлады. Яны далі нат фармальную згоду на сталыя беларускія перадачы й можна спадзявацца, што праз якія паўгады, а найпазьней праз год часу, калі ў Гішпаніі будзе скончаная пабудова новай вялікай радыястанцыі, месца для нас там знойдзецца. Тымчасам, праз мадрыцкае радыё беларускія перадачы надаюцца толькі ў дні нашых нацыянальных сьвятаў.

Асаблівыя намаганьні рабілі нашыя палітычныя дзейнікі, каб атрымаць перадачы ў ангельскім радыё БіБіСі.

Адказ ангельцаў на згаданыя намаганьні быў і цікавы й своеасаблівы. У прынцыпе яны быццам цалкам нас ра-

Пяты Кангрэс БАЗА

20-га й 21-га лютага г. г. у Нью-Ёрку адбыўся Пяты па чарзе Кангрэс-Зьезд сяброў нашае найбольшае грамадзкае арганізацыі ў ЗША — БАЗА.

На Кангрэс зьехаліся былі дэлегаты з Чыкага, Дэтройту, Спрынгфільду, Саўт-Рывэру, Нью-Брансьвіку, Бікану, ня лічачы дэлегатаў мясцовае Нью-Ёрскае Акругі БАЗА з аддзеламі Мангэттэн, Бруклін і Мэспэт. Аддзел Кліўлэнд, найбольшы пасьля Нью-Ёрку Аддзел Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў ЗША, на сёлетні Пяты Кангрэс БАЗА сваіх дэлегатаў ня прыслаў. Усіх дэлегатаў з правам вырашальнага голасу было 73, апрача гэтага, на Кангрэсе было шмат беларусаў — не дэлегатаў, як гасьцей. Як летась, гэтак і сёлета, Кангрэс адбываўся ў залі пад царквой сьв. Тройцы, у якой выконвае Службы Божыя Япіскап БАПЦарквы Яго Прэасьвяшчэнства Уладыка Васіль.

Кангрэс пачаўся ў сыботу ранічай малебнам, адслужаным Уладыкам, а тады ўсе перайшлі ў залю, дзе Кангрэс быў неўзабаве адчынены Старшынёй БАЗА сп. Ф. Кушэлям.

Прывітаўшы дэлегатаў і гасьцей, сп. Ф. Кушэль вёў Кангрэс да выбараў Прэзыдыюму Кангрэсу, у які ўвайшлі, як старшыня — сп. Тулейка, заступнікам — сп. М-ч і два сакратары. Першым прывітаў Кангрэс Яго Прэасьвяшчэнства Уладыка Васіль, а тады — Прэзыдэнт Рады БНР сп. інж. М. Абрамчык, які сказаў, зьвяртаючыся да Кангрэсу й заклікаючы яго да працы й згоды, гарачую й шчырую прамову, якая зрабіла моцнае ўражаньне на ўсіх дэлегатаў.

Сёлетні Кангрэс БАЗА быў вельмі цікавы. Ён абмяркаваў шмат справаў, зьвязаных із грамадзкім жыцьцём беларускае эміграцыі у ЗША. Із справаздачы аб дзейнасьці Галоўнае Управы БАЗА, а гэтак сама й з справаздачаў Управаў іншых Аддзелаў БАЗА выявілася, што аднэй з галоўных прычынаў некаторых недацягненьняў у працы арганізацыі было перацяжаньне працай кіруючых органаў БАЗА й недахоп матар'яльных сродкаў, а таксама нястача собскага памешканьня, дзе можна было-б канцэнтраваць беларускае грамадзкае й культурнае жыцьцё.

Пасьля кароткай дыскусіі над справаздачамі, Кангрэс удзяліў абсалюторыюм адыходзячай Управе БАЗА й прыступіў да выбараў новае Управы.

З запрапанаваных прысутнымі кандыдатаў на Старшыню Галоўнае Управы БАЗА, у ліку якіх быў і дасюлешні Старшыня БАЗА Ф. Кушэль, які, аднак, вельмі станоўка сваю кандыдатуру зьняў, Кангрэс аднагалосна праз акляматацыю выбраў на старшыню Галоўнае Управы БАЗА на 1954-55 год сп. М. Тулейку, добра ведамага нашаму беларускаму грамадзтву сваімі арганізацыйнымі здольнасьцямі й адданай працай, як кіраўнік беларускіх скаўтаў і старшыня Згуртаваньня Беларускае Моладзі ў Амэрыцы. Рэшта сяброў Управы была выбраная часткава праз акляматацыю, а часткава галасаваньнем.

Месца першага заступніка Старшыні Галоўнае Управы БАЗА аддадзенае Аддзелу Кліўлэнд, лучна з Аддзеламі Дэтройт і Чыкага. Другім заступнікам Старшыні БАЗА выбраны сп. М. Міцкевіч, сакратарамі сп. П. М-скі й сп. Іна Рыттар, скарбнікам сп. А. Протас. Рэфэрэнтамі Сацыяльнае Апекі выбраныя сп-ні Сьпічонак і Ганна А-ч, прэсавым рэфэрэнтам — сп. Р. Казак. У Рэвізыйную Камісію ўвайшлі сп. сп. Др. В. Тумаш, А. Стагановіч і Я. Ніхаёнак.

У сучасны момант перад новаабранаю Управай БАЗА стаяць вельмі адказныя заданьні. Напрацягу чатырох год свайго існаваньня, БАЗА здабыла ўжо не малую папулярнасьць ня толькі сярод эмігрантаў беларусаў, вялізарная бальшыня якіх зьяўляюцца на сяньня сябрамі арганізацыі, але й сярод іншых нацыянальнасьцяў ды і амэрыканцаў. Галоўная Управа БАЗА знаходзіцца ў сталым кантакце з шмат якімі ведамымі ўстановамі да Амэрыканскага Кангрэсу ўлучна. Таму — працы новаабраная Управа будзе мець ня мала і ёй трэба пажадаць адно ўдачы й спору ў выкананьні прынятых абавязкаў.

Перад зачыненьнем Кангрэсу новы Старшыня БАЗА сп. М. Тулейка зьвярнуўся быў да папярэдняе Управы БАЗА із шчыраю падзякай за выкананую ёю працу. У адказ былы Старшыня Ф. Кушэль запэўніў новаабраны ўрад у сваёй наважнасьці заўсёды дапамагчы яму ў патрэбе. Прыгэтым, як новаабраны, гэтак і адыйшоўшы старшыні БАЗА выразілі асаблівую падзяку рэфэрэнту Сацыяльнае Апекі папярэдняе Управы БАЗА сп-ні Б. Вержбаловіч, якая напрацягу трох год ахвярна працавала па лініі сацыяльнае апекі, няўтомна зьбіраючы й высылаючы грошы й вопратку суродзічам-беларусам у Эўропе й дапамагаючы ладзіць розныя імпрэзы з дабрачыннай мэтай, за што ёй запраўды належыцца вялікая падзяка ад усяго беларускага грамадзтва.

Пасьля прыняцьця рэзалюцыі з прывітаньнем Прэзыдэнту ЗША ген. Двайту Д. Айзэнгаўэру, Пяты Кангрэс БАЗА быў зачынены.

Дэлегат

НЯУДАЛЫ ДЫПЛЯМАТ ці штосьці іншае?

У „Беларускай Трыбуне" за лістапад 1953 г. зьмешчаны вялізарны, бо блізу на палову гэтае „газэты" артыкул, мэтай якога было, як відаць, паказаць сваім чытачом вялічэзныя дасягненьні „дыпляматаў БЦР" на амэрыканскім грунце.

Артыкул пачынаецца на першай балонцы тлустымі сантымэтравымі літарамі наўздоўж пяцёх шпальтаў гучным загалоўкам: **„Беларусь і Украіна перад Кангрэсам ЗША"**, а далей зьмешчаны вялікі здымак др. Шчорса побач із спняй Ф. П. Болтам і Л. Т. Смітам — сябрамі падкамісіі замежных справаў Кангрэсу ЗША. Недасьветчанаму чытачу можа здацца, што др. Шчорс і запраўды даканаў нечага нязвычайнага, — бо-ж дакуманты! — факт! камісія „на ліцо", а перад ёй і „беларускі дыплямат"!

Але той, хто хоць трошкі разумеецца на палітыцы не патрапіць без абурэньня чытаць гэтую, дай Божа, каб адно наіўную, але на наш розум вылучна нам шкадную „споведзь" др. Шчорса.

Пагялдзімо-ж, як гэты новасьпечаны „дыплямат" БЦР прадстаўляў сваю „Беларусь" перад „Кангрэсам" ЗША.

Пачынаючы сваю прамову др. Шчорс гаворыць: **„Для мяне гэта тымбольшая чэсьць, калі прымем пад увагу факт, што маё выступленьне зьяўляецца першым у гісторыі выступленьнем прадстаўніка беларускай арганізацыі перад так высокім целам, якім ёсьць Камісія Загранічных Справаў Палаты Рэпрэзэнтантаў** (падкр. намі — Рэд.)

Лёгка сабе уявіць, якое ўражаньне аб беларускім народзе маглі займець сп-ня Болтан і сп. Сміт, пачуўшы гэткія уступныя словы др. Шчорса, што беларусы ўпяршыню выступаюць перад так высокім целам! Зразумелая рэч, ні сп-ня Болтан, ні сп. Сміт ніколі дагэтуль аб сабе не падумалі, што яны зьяўляюцца аж так высокім і так недаступным целам, і таму, бясспрэчна, зрабілі выснаў, што мізэрны гэта, відаць, народ беларусы, калі ўпяршыню ў гісторыі яны „гэтак высока дапялі".

Справа тут аднак, ня ў асабістым камплексе ніжэйшасьці Шчорса, не ў ягоным пачуцьці унтэрмэншства, а ў наскрозь хвальшывай інфармацыі чужынцаў аб беларускім народзе прадстаўленым перад амэрыканскімі кангрэсмэнамі у запраўдным унтэрмэншаўскім выглядзе.

Прадстаўнікі беларускага народу, як ведама сяньня ня толькі беларускаму інтэлігенту, але й кажнаму сьведамаму беларусу-работніку, напрацягу сваёй гісторыі ня толькі „прадстаўляліся" перад так высокім целам" — Гасподай Рэпрэзэнтантаў ЗША, перад якою дзьверы для кажнага, хто тут жыве, адчыненыя, а што прадстаўніцтвы нашыя ня раз і ня дзесяць разоў зьбіраліся й абмяркоўвалі нашыя справы перад наймагутнейшымі сувэрэнамі сьвету. Гэтак было напрацягу гісторыі. Але ня трэба сягаць аж так далёка ў гісторыю. Ня трэба навет прыгадваць і пары 1919-20 гадоў, калі прадстаўнікі БНР засядалі на Вэрсальскай Мірнай Канфэрэнцыі паміж народаў сьвету, прадстаўлялі нашыя праблемы ў Лізе Нацыяў, прад Амэрыкай, прэз. ЗША Вільсанам, (пра што навет бальшавікі ня так даўно падавалі былі ў друку дакуманты), калі шмат якія прэзыдэнты прыймалі нашых амбасадараў (1918-20 г.г.). Шмат можна было-б сказаць на гэтую тэму і аб пазьнейшых часох...

Ці др. Шчорс усяго гэтага ня ведаў, ці яму хацелася адно пахваліцца, што ён, у пяршыню ў гісторыі рэпрэзэнтаваў беларусаў? Справа ня ў гэтым, а толькі ў тым, што якраз гэтай сваёй „унтэрмэншаўскай" заявай — ён, бясспрэчна, „зарэпрэзэнтаваў" „Беларусь", — мякка кажучы — скандальна.

У мэмар'яле Шчорса знаходзім і іншы, няменш цікавы „дыпляматычны аргумэнт", якім ён хоча пераканаць амэрыканцаў у карыснасьці для іх абмены дыляматычнымі прадстаўніцтвамі з БССР.

Ён (др. Шчорс) гаворыць:

— „дыпляматычныя дачыненьні паміж ЗША й гэтымі дзьвума Савецкімі рэспублікамі (справа аб БССР і УССР — зац. Рэд.) створаць спрыяльную нагоду для навязаньня кантакту з кіраўніцтвамі актыўнага й пасыўнага руху супраціву гэтых двух нацыяў".

Калі-б гэткія рэчы былі некім сказаныя дзе-колечы й каму-колечы прыватна, як кажуць — на вуха, можна было-б **яшчэ даравацъ, але калі наш „дыплямат" гаворыць гэта перад камісіяй, а пасьля падае гэта яшчэ і ў друку — дык тут ужо інакш, гэтага не назавеш, як правакацыяй на карысьць бальшавікоў.**

Ня дзіў, што само на вусны просіцца ведамае расейскае выслоўе — „услужливый дурак опаснее врага", бо словы Шчорса даюць бальшавіком як раз гэткі аргумант, які ім толькі й патрэбны, каб не дапусьціць таго дыпляматычнага прадстаўніцтва, якое ўжо згары прадугледжанае парушаць міжнароднае права, за што кажная дзяржава выкідае прадстаўніцтвы за свае межы.

Трэйцім і ўжо цікавым зь іншага боку мамэнтам мэмарыялу Шчорса зьяўляецца для нас ягонае „новае" палітычнае крэдо, у якім Шчорс сябе поўнасьцю дэмаскуе як беларускага патрыёту.

Бо вось чытаем:

— „Маючы на увазе й выходзячы вылучна з пункту гледжаньня дабра маёй новай бацькаўшчыны — Злучаных Штатаў Амэрыкі й краю майго паходжаньня — Беларусі ды агульна людзкіх прынцыпаў і аб'ектывізму — пастараюся паколькі гэта магчыма... прадставіць праблему" й г. д.

Др. Шчорс, нядаўны яшчэ ледзь ня перцы з першых патрыётаў Беларусі — які зусім не хавае сваіх прэтэнзіяў на „прымаса" Беларусі — заяўляе сяньня перад усімі, што мае **новую бацькаўшчыну** і што Беларусь для яго ўжо толькі краіна паходжаньня.

Можа каму тут здацца, што Шчорс хацеў сваім вырачэньнем беларускасьці, граючы ролю патрыёты Амэрыкі (бо-ж „мае на ўвазе й выходзе выключна з інтарэсаў" сваёй новай бацькаўшчыны) атрымаць большыя сымпатыі ў камісіі... Але гэта можа здацца толькі тым, хто параўноўваў-бы Амэрыку з Польшчай ці кім іншым.

Цікава будзе таму прывесьці тут прыклад, як іншыя народы, прыкладам расейцы з паходжаньня, разумеюць свае абавязкі перад Амэрыкай. У газэце „Русская Жизнь" за 17 лістапада 1953 г. у артыкуле „Наш флаг" чытаем:

„Нашыя палітычныя паводзіны нас, расейцаў, і вызначаныя й устаноўленыя. Мы ня выракаліся Расеі. Ды ад нас яго свабодная Амэрыка й не вымагала. Гэткае абавязацельства было-б парушэньнем правоў чалавека й грамадзяніна, якія складаюць аснову Амэрыканскай канстытуцыі...

І калі які-небудзь туляк або янісеец у сваім раптоўным, скажам, амэрыканізьме у пастановах або поглядах што-да расейскага пытаньня бароніць толькі бесстаронную амэрыканскую пазыцыю, ён або груба й без патрэбы ільсьціць, або йлжэ.

Для чэснага чалавека гэтая бесстароннасьць проціпрыродная. Ніякі запраўдны амэрыканец гэткаму раптоўнаму ператварэньню расейца ў амэрыканца усё адно не паверыць і паставіцца да гэтага ператварэньня як да вельмі нячыстае стаўкі на палітычную кар'еру" (пераклад наш. — Рэд.).

Гэткае вось палітычнае крэдо расейцаў. Крэдо іх — „Флаг — России". Крэдо Шчорса — гэта „неопрятная ставка на политическую карьеру" — **дэкларацыя дзейнасьці выключна ў інтарэсах новай бацькаўшчыны,** называючы Беларусь **адно „краінай** свайго паходжаньня", чым **ставіць яе** ў зьневажлівае паложаньне. Бо паходжаньне пры гэткай пастаноўцы не абавязвае нейкімі сувязямі зь ім пачуцьцяў любасьці й пашаны. А якраз край нашых бацькоў — Бацькаўшчына, патрыятызм, любасьць да роднага, змаганьне за Радзіму, за ейнае вызваленьне, вось дзе сэнс нашага быцьця на чужыне, вось дзе наш сьцяг — сьцяг

(Канец на 4-ай бал.)

зумелі і зь вялікай прыемнасьцяй згадзіліся-б улучыць нашыя перадачы ў сваю праграму, але пыталіся — чаму мы ня маем перадачаў з амэрыканскіх радыёстанцыяў, якія даюць так лёгка голас усім іншым, апрача нас, народам. Пытаньне гэтае ставілася гэтак: калі амэрыканцы, якія маюць такія шырокія матар'яльныя магчымасьці, адмаўляюць беларусам у перадачах, дык пагатове яны, бедныя ангельцы, ня могуць іх нам даць. Далікатна напаміналася таксама, што, відаць, нашыя перадачы ня маюць важнейшага значаньня.

Зьдзіўленьне, чаму мы ня маем перадачаў з амэрыканскіх станцыяў і гэткі-ж сумлеў выяўлялі з свайго боку і французы, і італьянцы, і гішпанцы.

Дзеля прыгаданага, нашыя дамаганьні займець свае радыёперадачы ў амэрыканскіх радыёстанцыях ня спыняліся й далей, ня гледзячы на ўсе пералічаныя гэтта перашкоды й няўдачы.

Новая амэрыканская Радыёстанцыя „Вызваленьне" (Liberation).

У 1951 годзе на палітычнай арэне зьяўляецца добра ўжо ведамы сяньня кажнаму Амэрыканскі Камітэт Вызваленьня ад бальшавізму (самперш — Амэрыканскі Камітэт Вызваленьня народаў Расеі), які ў праграме сваёй шырокай палітычнай акцыі прадбачаў і пабудову Радыёстанцыі. Улетку 1952 г. станцыя гэтая, названая „Вызваленьне", і была пабудаваная пад Мюнхэнам.

Месца для беларусаў у гэтай радыёстанцыі ўжо ніхто не адмаўляў. Яго можна было мець ад першага-ж дню адкрыцьця прыгаданае станцыі. Адна з беларускіх бээнэраўскіх арганізацыяў — БАФ і пачала ўжо была падрыхтоўчую працу да наладжаньня беларускіх перадачаў праз радыёстанцыю „Вызваленьне". Старшыня БАФ-у — інж. Жытка — увайшоў быў у радыёвую камісію й падшукваў ужо сабе адпаведны пэрсанал.

Неўзабаве адылі хуткаму зьдзейсьненьню нашых перадачаў перашкодзілі прычыны палітычнага парадку.

Побач з працай радыёкамісіі 4 расейскія арганізацыі і 5 арганізацыяў нерасейскіх стварылі палітычную камісію (у якой беларусы удзелу не ўзялі) й апрацавалі праэкт статуту для стварэньня палітычнага міжнацыянальнага цэнтру, г. зв. „КЦАБ-у". Увосені 1952 году была скліканая канфэрэнцыя, мэтай якой было прыняцьце запраэктаванага статуту КЦАБ-у — на якую быў запрошаны й БАФ. Статут КЦАБ-у быў прыняты ўсімі ўдзельнікамі канфэрэнцыі, апрача дэлегатаў ад БАФ-у, якія адмовіліся яго падпісаць, пакідаючы канфэрэнцыю.

Амэрыканскі Камітэт Вызваленьня ад Бальшавізму, ня гледзячы на адсутнасьць у нова-створанай арганізацыі гэткіх паважных народаў, як беларусы й украінцы — Статут КЦАБ-у зацьвердзіў і падпісаў зь ім умову супрацоўніцтва, паводле якой радыё „Вызваленьне" пераходзіла ў рукі й пад кантролю КЦАБ-у, а па праўдзе пад кантролю расейцаў, бо гэтыя мелі ў КЦАБ-е 50% галасоў, а да гэтага запэўненыя галасы некаторых прарасейскіх апартуністычных арганізацыяў, якія ўваходзілі ў склад КЦАБ-у.

Гэткім чынам палажэньне стварылася для нас вельмі няпрыхільнае. Атрымаць права на радыёперадачы із станцыі „Вызваленьне", не належачы да КЦАБ-у, было немагчыма. Прыняць-жа палітычную плятформу КЦАБ-у было з гледзішча на ейную супярэчнасьць з нашымі нацыянальнымі ідэямі ды імкненьнямі, таксама цалкам немагчыма.

Кіраўніцтва КЦАБ-у з Мяльгуновым і Керанскім на чале, падтрыманае некаторымі дзейнікамі Амэрыканскага Камітэту (перадусім мр. Александэрам, з паходжаньня расейцам), намагалася папоўніць КЦАБ угодніцкім элемэнтам іншых нерасейскіх нацыянальнасьцяў. Гэткія знаходзіліся. Надарыліся й кандыдаты з беларускага боку. Самперш Астроўскі, прыехаўшы з Аргэнтыны, пачаў намаганьні, каб увесьці ў склад КЦАБ-у дзьве свае арганізацыі — „вызвольны рух" Зарэцкага й „патрыётаў" Попкі, а пазьней і сваю „Раду". Яшчэ ў кастрычніку 1952 году Астроўскі наведаў Мюнхэн і склаў **асабіста візыты усім расейскім арганізацыям і рэдакцыям, заяўляючы ўсюды, што ён цалкам пагаджаецца із статутам КЦАБ-у** — абы толькі ўлезьці ў радыё. Пачалі, як грыбы, расьці розныя фікцыйныя „арганізацыі" і ў іншых народаў — зьявілася гэткая „арганізацыя" і ў беларусаў зь нейкім Рэпніным на чале.

Арганізацыя КЦАБ лічылася Амэрыканскім Камітэтам дастаткова аўтарытэтным „міжнацыянальным цэнтрам", і ёй была дадзеная шырокая матар'яльная дапамога. Апрача Мюнхэнскай радыёстанцыі — заплянаваная была пабудова й іншых новых станцыяў.

Павагу палажэньня зразумелі нарэшце й тыя палітычныя дзеячы нерасейскіх народаў, якія да гэтага часу прыглядаліся да акцыі Амэрыканскага Камітэту з боку, або й змагаліся зь ім „байкотам". Яны ўзяліся за перагляд свае дасюлешняе тактыкі. У выніку гэтага ў сакавіку 1953 г. паўстаў г. зв. „Парыскі Блёк", які радыкальна зьмяніў усё палажэньне. Перамовы „Парыскага Блёку" з Амэрыканскім Камітэтам у красавіку 53 г., якія праводзіў ад імя Блёку прэз. Абрамчык, прывялі да таго, што Амэрыканскі Камітэт стаў на шлях перагляду сваёй дасюлешняй палітыкі ў дачыненьні да КЦАБ-у. Мюнхэнская канфэрэнцыя ў маі-жніўні 1953 г. канчальна пераканала амэрыканцаў, што КЦАБ не патрапіць выканаць ускладзеных на яго заданьняў. Трохмесячная Мюнхэнская канфэрэнцыя паказала амэрыканцам, якую сілу прадстаўляе „Парыскі Блёк" і пераканала іх, што з голасам ягоным трэба паважна лічыцца.

Таму, як ні кідаліся, як ні змагаліся Керанскі — Мяльгуноў, каб захаваць гэтак дагодную ім „міжнацыянальную" арганізацыю КЦАБ — а разам з гэтым утрымаць у сваіх руках і радыёстанцыю „Вызваленьне", — гэта ім не ўдалося.

Неўзабаве Амэрыканскі Камітэт наважыў парваць умову аб супрацоўніцтве з КЦАБ-ам і спыніў яму ўсякую матар'яльную дапамогу, а ўрэшце — высяліў усе кцабаўскія арганізацыі з прыдзеленых ім памешканьняў, плянуючы стварыць нейкі новы каардынацыйны цэнтар, у які-б увайшлі й арганізацыі, задзіночаныя ў „Парыскім Блёку"

Тымчасам-жа, пакуль яшчэ ўмова з гэткім новым міжнацыянальным цэнтрам усіх народаў СССР амэрыканцамі не падпісаная, сябром „Парыскага Блёку" было запрапанавана узяць удзел у перадачах радыёстанцыі „Вызваленьне", вызваленай з рук і з пад кантролю расейцаў.

Усе сябры „Парыскага Блёку" згадзіліся прыняць гэтую прапанову Амэрыканскага Камітэту. Беларусы й украінцы, якія ня мелі дагэтуль у радыёстанцыі „Вызваленьне" сваіх перадачаў, узяліся за арганізацыю іх, а тыя сябры „Парыскага Блёку", перадачы ў мове якіх надавалі дагэтуль іхныя апартуністычныя арганізацыі, што уваходзілі ў склад КЦАБ-у, пачалі рэарганізаваць іх

Паводле дамоўленасьці з Амэрыканцамі, кажная нацыянальная сэкцыя радыё „Вызваленьня" будзе цяпер зусім **аўтаномнай і самастойнай,** падлягаючы адно кантролю амэрыканцаў.

Як будзе выглядаць беларуская сэкцыя радыёперадачаў і ў якой арганізацыйнай стадыі яна сяньня знаходзіцца?

1. Дырэктарам Беларускай Сэкцыі радыёперадачаў зацьверджаны амэрыканцамі сп. праф. др. Жук, які ўжо прыехаў у Мюнхэн. Ён мае падабраць сабе 4-ох супрацоўнікаў, якія будуць складаць разам дырэкцыю Беларускай Сэкцыі у Мюнхэне.

2. Апрача дырэкцыі, як стала аплачваны пэрсанал будуць яшчэ пакліканыя ад 2 да 4-ох г. зв. манітораў, заданьнем якіх будзе падслухоўваць менскую й іншыя беларускія савецкія радыёстанцыі, каб потым камэнтаваць іх.

3. Для Сэкцыі будзе таксама арганізаваная група супрацоўнікаў — „скрыптараў". У Нью-Ёрку, дзе жыве найбольш беларускай інтэлігенцыі, гэтая група, пэўне, і будзе створаная. Супрацоўнікі-„скрыптары" маюць пісаць артыкулы якія, узгодненыя самперш з амэрыканцамі ў Нью-Ёрку, будуць пасылацца ў канчальна гатовым выглядзе ў Мюнхэн, дзеля перадачы іх праз радыё.

Гэткія-ж скрыпты-артыкулы й іншыя весткі могуць пісаць і дасылаць усе беларусы, у якім-бы кутку сьвету яны не знаходзіліся, перасылаючы ўсе матар'ялы беспасярэдна ў Мюнхэн дырэктару Беларускай Сэкцыі радыё „Вызваленьне".

4. Праграма беларускіх перадачаў разьлічаная тымчасам на 15-20 хвілінаў штодня. Яна будзе паўтарацца 5-6 раз напрацягу аднае пары (24 гадз.).

Мяркуецца пашырыць пазьней праграму беларускіх перадачаў да паўгадзіны штодзённа. У сувязі з гэтым, зразумела, павялічыцца й пэрсанал дырэкцыі Беларускай Сэкцыі.

Перадачы маюць пачацца за які месяц-паўтары.

Радыёстанцыя „Вызваленьне" зьяўляецца аднэй з наймацнейшых амэрыканскіх станцыяў, пабудаваных паводле апошніх тэхнічных узораў, з новымі магутнымі апаратамі, перашкодзіць працы якіх не патрапяць ніякія глушыльнікі бальшавіцкіх машынаў.

Гэткім вось чынам, пасьля блізу 4-х гадовага змаганьня з рознымі перашкодамі, голас беларусаў паплыве нарэшце у эфір, надаваны колькі раз у дзень наймацнейшай амэрыканскай станцыяй „Вызваленьне".

М.

Зьезд БАПЦ у Сыднэю

Як мы ўжо паведамлялі, у днёх 25-26-га сьнежня 1953 г. ў Сыднэі, Аўстралія, адбыўся Зьезд БАПЦарквы пад кіраўніцтвам Яго Высокапрэасьвяшчэнства Архіяпіскапа Сергія з удзелам сьвятарства й грамадзтва.

Зьезд пачаўся 25-га сьнежня ўрачыстым Малебнам а на другі дзень, 26-га сьнежня, адбылася Саборная Багаслужба Яго Высокапрэасьвяшчэнства Архіяпіскапа Сергія ў асысьце Сьвятароў Епархіі.

Зьезд дакладна абмяркаваў нашае сучаснае царкоўнае жыцьцё у Аўстраліі й прыняў наступныя пастановы:

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа.

Мы, Пастыры й вернікі сьв. Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы, сабраныя на гэтым Зьезьдзе нашым у Аўстраліі пад кіраўніцтвам Главы нашае Царквы, Высокапрэасьвяшчэньнейшага Архіяпіскапа Сергія, у днёх 25-26-га сьнежня, Року Божага 1953-га, узносім падзяку Міласэрнаму Госпаду, Спасіцелю й Богу нашаму, што Ён, пасьля доўгіх нашых цярпеньняў і пакутаў мінулых гадоў, даў нас сабрацца ў Вінаградніку сьв. БАПЦарквы, каб мы й далей, па прыкладу нашых продкаў, славілі й праслаўлялі Цудоўнае й Велічнае Імя Яго.

Сілу веры й натхненьне Сьвятога Духа, адзінства ў думках і ўзаемную пашану й любоў выпрасіўшы сабе, гэтым сьцьвярджаем і абвяшчаем:

1. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква ў Аўстраліі зьяўляецца непадзельнаю часткаю Сьв. Беларускае Праваслаўнае Царквы, якая паўстала на Беларусі ад часу прыняцьця нашым Народам сьв. Хрыстовае Веры й дала нам такіх слаўных, сьвятых Угоднікаў Божых, як сьв. Еўфрасіньня, сьв. Кірыла Тураўскі — беларускі Златавусны, сьв. Віленскія мучанікі й шмат іншых Праведнікаў, Сьвяціцеляў, Мітрапалітаў.

2. Аўтакефальны характар нашае сьв. Царквы быў неаднакратна пацьверджаны на працягу нашае гісторыі ў Наваградку, Вільні й Менску, апошнім часам у 1942 г. і на Саборы ў Канстанцы ў 1948 г., а кананічнасьць яе была сьцьверджаная Блажэньнейшым Дзянісом, Мітрапалітам Варшаўскім, Главою Праваслаўнае Аўтакефальнае Царквы ў Польшчы, ды сьв. п. Мітрапалітам Аляксандрам Пінскім і Палескім. Шматлікія нашы Мітрапаліты былі ў свой час зацьверджаныя Усяленскімі Патрыярх[illegible] чале з Кан[illegible]нопальскім.

3. Пад уплывам апошніх сусьветных падзеяў наша сьв. БАПЦарква апынулася вонкі Бацькаўшчыны, але яна й цяпер зьяўляецца часткаю Адзінае сьв. Усяленскае Праваслаўнае Царквы, і непарушна перахоўвае яе дагматычныя й кананічныя асновы.

4. Усякія пастановы агульна-царкоўнага характару для ўсяе БАПЦарквы зацьвярджае яе Сабор Япіскапаў (Прав. Сьв. Апост. 34, Анціах. 9 і інш.), а ў межах Епархіяў наша Царква кіруецца сваімі Япіскапамі й пастановамі Сабораў, або Зьездаў.

5. Шчырымі малітвамі й з вялікаю ўдзячнасьцю ўспамінаем усіх тых нашых мучанікаў — Ерархаў, Духавенства й верных, якія аддалі жыцьцё сваё у змаганьні супраць бязбожнікаў за сьв. Царкву нашу, за Веру Хрыстовую, за дабро й спасеньне душаў нашых суродзічаў.

6. З любоўю ўспамінаем усіх тых братоў і сёстраў нашых, якія сьвята перахоўваюць веру продкаў нашых і пакутуюць у няволі духоўнай і нацыянальнай на Роднай Зямельцы нашай, і просім Міласэрнага Госпада, каб Ён памог ім і нам усім на выгнаньні штонайхутчэй дачакацца вызваленьня ўкрыжаванае нашае Маці-Беларусі, ды ўзмацніў нашу Веру й Любоў да Яго.

7. З вялікаю любоўю перасылаем нашы брацкія прывітаньнні ўсім нашым сьв. Цэрквам і ўсім нашым суродзічам па ўсіх краінах вольнага сьвету, і запэўняем іх у нашым шчырым жаданьні тварыць з усімі імі Адзінае Цела Сьвятое Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы пад кіраўніцтвам нашага Сабору Япіскапаў, Богу на Славу, а ўсім нам на дабро й спасеньне.

8. Дакладна абгаварыўшы й разважыўшы ўсе дасюлешнія асягненьні й недахопы нашага царкоўнага жыцьця ў Аўстраліі, мы выбралі новую Епархіяльную Управу на Аўстралію й Новую Зэляндыю, якая, пад кіраўніцтвам Яго Высокапрэасьвяшчэнства Архіяпіскапа Сергія, пастараецца ўзмоцніць нас духова й матарыяльна й забясьпечыць нармальную пастырскую працу нашага Духавенства.

9. Усіх вернікаў нашае сьв. Царквы горача заклікаем цьвёрда й непахісна бараніць нашу прадзедаўскую Хрыстовую Веру, пашыраць і ўзмацняць узаемную любоў і пашану, ды ўсякім спосабам памагаць сваім Пастырам. Пастыраў жа, як слугаў Ісуса Хрыста, Бога нашага (I Цім. 4,6), заклікаем узмоцніць працу сваю ў Вінаградніку Яго, памятаючы, што Ён сказаў аб Добрым Пастыру, які ведае авец сваіх і авечкі ведаюць яго: „І, калі (Пастыр) вывядзе сваіх авечак, ідзе перад імі, і авечкі ідуць за ім, бо ведаюць голас яго" (Іо. 10,4).

Так дапаможа нам усім наш Пастыраначальнік Ісус Хрыстос і Прачыстая Маці Яго й усе Угоднікі Божыя нашае Маці-Беларусі. Амінь.

Сыднэй, 26-га сьнежня,
Року Божага 1953.

Прэзыдыюм Зьезду

З Беларускага Жыцьця

РЭФЭРАТ
Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва

У сыботу 27-га лютага ў памешканьні Украінскага Народнага Дому сп. праф. Л. Акіншэвіч, сябра БІН і М, прачытаў рэфэрат для сяброў Інстытуту й гасьцей на тэму: „Цывілізацыйныя Асновы Беларускага Гістарычнага Працэсу". Пасьля рэфэрату адбылася жывая й зьмястоўная дыскусія.

ДЗІЦЯЧАЯ ЯЛІНКА У СПРЫНГФІЛЬДЗЕ

Дня 17-га Студзеня г. г. Управа Аддзелу БАЗА ў Спрынгфільдзе наладзіла была ялінку для беларускіх дзяцей.

Праграма гэтае дзіцячае ўрачыстасьці складалася з інсцэнізацыі „Хрыстос нарадзіўся", танцу сьняжынак, танцу матылькоў і дэклямацыяў беларускіх вершаў. На заканчэньне дзеткамі быў вельмі ўдала выкананы народны танец „Лявоніха".

Пасьля дзіцячага канцэрту зьявіўся быў Дзед Мароз, які раздаў прыгожыя падарункі малым артыстым.

Калядная ялінка ў Спрынгфільдзе была аднэю зь першых беларускіх імпрэзаў у гэтым месьце й вельмі усьцешыла як нацых дзетак, гэтак і ізных бацькоў.

Прысутны.

СУСТРЭЧА НОВАГА ГОДУ

Сёлетняя Сустрэча Новага Году беларускім грамадзтвам мінула вельмі ўдала й вясёла. Гэтым разам у вялікай і прыгожай залі „Прэмьер Палацу" сабраліся супольна, сваёй беларускай сям'ёй сустрэць Новы ды правесьці Стары Год ня толькі беларусы НюЁрку, але й нашае грамадзтва з блізкіх і далейшых ваколіцаў. Наагул, трэба сьцьвердзіць, што гэткія імпрэзы, як сёлетняя сустрэча Новага Году нашым беларускім грамадзтвам, калі беларусы зьбіраюцца разам пасьля цяжкой фабрычнай працы й клопатаў, неразлучных із працаю на ніве грамадзкай, каб адпачыць духова, — дае нязвычайна добрыя вынікі. Прыгожая заля, добрая аркестра, спраўная арганізацыя й гэтым разам спрыялі й добраму настрою й агульнаму задаваленьню.

БАЛЬ БЕЛАРУСКАЕ МОЛАДЗІ

6-га лютага г. г. беларускае грамадзтва Нью-Ёрку й ваколіцаў гуляла на вялікім балі беларускае моладзі, арганізаваным як штогод Згуртаваньнем Беларускае Моладзі ў ЗША з мэтаю падмацаваньня касы згуртаваньня.

Баль быў вельмі ўдалы й сьцягнуў у прыгожую залю Ленокс Голл шмат гасьцей, як моладзі, гэтак і паважнейшых беларускіх палітычных, грамадзкіх ды культурных дзеячоў. Пачаўся баль моладзі адыграньнем невялічкага вясёлага скэтчу А. Кавалеўскага „Маёвы Жук", перахрышчанага нашымі артыстымі ў „Ашуканую цётку". Пастаўлены сп. Г. Паланевічам, з удзелам маладое тройкі Тусі Кушэль, Галіны Ганчарэнкі й М. Заморскага, скэтч мінуў жвава й вясёла, выклікаючы непаўстрымны сьмех і воплескі гледачоў.

Як рэжысэру, гэтак і маладым артыстым-удзельнікам належыцца шчырае прызнаньне, тым балей, што скэтч быў падрыхтаваны імі ў вельмі кароткім часе.

Пасьля пастаноўкі пачаўся сам баль і скокі пад вялікую й вельмі добрую аркестру, якія трывалі блізу да раніцы. На адмысловую ўвагу заслугоўваў багаты буфэт із смачнымі беларускімі стравамі, а асабліва дасканалая арганізацыя ўсяе імпрэзы, што ўжо сталася запраўднаю традыцыяю ўсіх пачынаньняў Згуртаваньня Беларускае Моладзі ў Амэрыцы.

ВЕЧАР ПРАПАГАНДЫ АРГАНІЗАЦЫІ YWCA

ІІ-га лютага арганізацыя YWCA ладзіла ў Нью-Ёрку, у кажным сваім Аддзеле, шырака апавешчаныя Вечары Пазнаньня арганізацыі YWCA і ейнае дзейнасьці. У праграме вечару было й выступленьне харавое й танцавальнае групаў нашага Згуртаваньня Беларускае Моладзі.

Выступ гэты быў прывітаны перапоўненою заляю вельмі горача.

У праграме згаданага вечару быў апрача канцэрту, наладжаны вельмі цікавы паказ "мастацкага" плаваньня ў нутраным плывальным басэйне YWCA, і выставы працаў розных курсаў YWCA (шыцьця, маляваньня й г. д.).

НЯУДАЛЫ ДЫПЛЯМАТ ЦІ ШТОСЬЦІ ІНШАЕ?
(Канец)

Беларусі — вечнай нашай Бацькаўшчыны, выракацца якой, як кажуць расейцы, амэрыканцы ад нас зусім не вымагаюць.

Др. Шчорс які, як нам ведама, мае яшчэ толькі „першыя паперы", гэта значыцца толькі на нейкія 25% грамадзянін Амэрыкі — зракаецца Беларусі!

Прыклад „дыпляматы" БЦР нас ня дзівіць — прыкладаў яшчэ горшых гэткіх „дыпляматаў" Астроўскага можна было-б знайсьці больш. Але прыклад Шчорсаўскага „патрыятызму" абуральны, і тым балей прыкры, што мае ўжо некаторыя ўплывы на сваё Бэцээраўскае акружэньне, дзе, як нам ведама, некаторыя гэткія-ж крыклівыя, як і Шчорс „патрыёты", адбыўшы вайсковую службу, ў амэрыканскай арміі, употайкі ад сваіх бацькоў зьмянілі свае беларускія прозьвішчы на прозьвішчы з трох і чатырох літараў, хаваючы сваё „паходжаньне", каб ня было ніякіх сьлядоў нейкіх там „краінаў", а толькі нешта тутэйшае, зьвязанае з **новай** бацькаўшчынай.

Расейцы кажуць, што такого скорасьпелага амэрыканца запраўдныя амэрыканцы сустракаюць з падозраньнем. І гэта зусім зразумела.

Як-жа мае зразумець наш чытач гэткі крыклівы й самарэклямны артыкул, як шчорсаўская „Беларусь перад Кангрэсам ЗША"?

Здаецца, што накш, як яго трэба й можна разумець, ніхто яго й незразумее.

Н. Д.

ПАДЗЯКА

Сям'я С. Гутырчыка складае шчырую падзяку ўсім, хто дапамог ім пераехаць з Францыі ў ЗША.

У першую чаргу мы шчыра дзякуем сп. др. Станкевічу за высланы нам ашуранс, сп. Азарку за матар'яльную й маральную дапамогу, а таксама Аддзелу БАЗА ў Саўт-Рывэр — Нью-Брансьвік за пазыку 100 даляраў.

Сяргей, Ліцьвіна й Элеанора
ГУТЫРЧЫКІ

Грошы на „Беларуса" прыслалі:

Сп. Салановіч з Таронта	$ 1 00
Сп. Азарка за кальпартаж	$ 5.00
Сп. Дунец за кальпартаж	$ 11.00
Сп. Крэсла	$ 2.00
Сп. Норык	$ 2.50
Разам	$ 21,50

СПРАВАЗДАЧА
Аддзелу Сацыяльнае Апекі БАЗА
(Люты 1953 г. — Люты 1954 г.)

Прыбытак

Сальда на 1 сакавіка 1953 г.	59,65
Ахвяры на дапамогу	283,50
Даход з канцэрту	45,95
Сяброўскія складкі	13,50
Ахвяры бацькоў на ялінку	31,00
Разам	388,60

Выдатак

Грашовая дапамога суродзічам у Эўропе	270,30*)
Паштовая аплата пачкаў	70,51
Выдаткі на ялінку	29,30
Канцылярыйныя выдаткі	2,70
Разам	372,81
Сальда	15,79

*) Выслана грашыма:

1. Камітэту ў Мюнхэне	$ 116,00
2. Камітэту ў Францыі	$ 35,00
3. Паасобным беларусам	$ 36,00
4. Арганізацыяў Інвалідаў у Бэльгіі й Францыі	$ 20,00
5. Дапамога ў Аўстрыю	$ 15,00
6. Хвораму Эльяшэвічу	$ 30,00
7. Дзецям сп-ні М.	$ 10,00
8. Дзеці-дзецям	$ 5,00
9. Паштовыя кошты	$ 3,30
Разам	$ 270,30

Высланыя Пачкі

Бел. Камітэту ў Францыі	2 пачкі
Бел. Камітэту ў Нямеччыне	12 пачкаў
Сп. Карповічу	2 пачкі
Сп. Кабычкіну	2 пачкі
Сп. Голдыщаву	1 пачка
Разам	19 пачкаў

СПРАВАЗДАЧА
Беларускага Нацыянальнага Камітэту аб харытатыўнай дзейнасьці за другую палову 1953 г.

Прыбытак

1. Атрымана грашы ад:	
Сп. Б. Русака (ЗША)	20,35 ДМ
Сп-роў Кажана, Галяка, Протаса і Ганэцкага	66,35 ДМ
Сп. М. Норыка (ЗША)	41,00 ДМ
БАЗА Дэтройт (ЗША) праз сп. Сердачэнка	506,65 ДМ
БАЗА ЗША праз Сп. В. Вержбаловіч	207,50 ДМ
Разам	841,85 ДМ

Выдатак

1. Выдана індывідуальная дапамога грашыма 9 асобам	142,60 ДМ
2. Высланы да Калядных Сьвятау прадуктовыя пачкі у наступнкя лягеры: Франкфурт — 3 пачкі, Штэтэнгофэн (Аусбург) — 10, Вайдэн — 2, Амбэрг — 5, Дэшынг — 2, Людвігсфэльд — 2, Лянсгут — 3, Рэгенсбург — 2, Вайгайм-Ауэрбах — 2, Інгольштадт — 1, Дэгендорф — 5, Брауншвайг — 2, Багнанг — 1, Остэродэ — 1, усяго выслана 41, пачка на суму	417,70 ДМ
3. Выплачана пошце за рассылку 12 адзяжовых пачак	15,28 ДМ
4. Выплачана пошце за дастауку адзяжовых пачак і старых рэчау з Чырвонага Крыжу	24,60 ДМ
5. Канцэлярыйныя выдаткі	3,00 ДМ
Разам	603,18 ДМ

Беларускі Нацыянальны Камітэт за другую палову 1953 году атрымаў адзяжовыя пачкі ад наступных асобаў: сп. М. Мікуліч (Аустралія), Сп. В. Будзькі, Юрэвіча й Кажуры (ЗША) па аднэй пачцы і 8 пачкаў ад БАЗА праз сп. В. Вержбаловіч. Разам атрымана 12 адзяжовых пачкаў. З атрыманых адзяжовых пачкаў адзежа разьмеркаваная й разасланая ў справаздачным паўгодзьзі 5 пачак, а рэшта — 7 пачак, у сувязі з позным атрыманьнем, разьмяркаваныя ў пачатку 1954 года.

Усім нашым суродзічам, якія складалі ахвяры грашыма й вопраткай і арганізатарам гэтае добрае справы, Беларускі Нацыянальны Камітэт прыносіць шчырую падзяку за ахвяры й за працу. Расьцярушаныя па Нямеччыне Беларусы, якія засталіся тут з незалежных ад іх прычынаў і знаходзяцца ў цяжкіх умовах жыцьця, у сваіх лістох дзякуюць сваім суродзічам за матар'яльную дапамогу, а таксама за тую маральную падтрымку й спагадлівасьць, якую яны адчулі ў дні Калядных Сьвятаў. Мы спадзяемся, што гэтая матар'яльная і маральная дапамога і надалей ня спыніцца, а будзе, наадварот, павялічвацца.

Мюнхэн, 1 студзеня 1954 г.

Беларускі Нацыянальны Камітэт

ШУКАЮЦЬ

Рагацэвіча Юліяна й Рагацэвіча Фэлікса, якія нарадзіліся ў вёсцы Адамава, Вішнеўскай гміны, Валожынскага павету й выехалі ў ЗША ў 1918-1919 годзе й, паводле весткаў, жывуць у Нью-Ёрку, шукае **Язэп Рагацэвіч, сын Сымона.** Весткі просім слаць на адрыс:

Asociacion Bielarussa en la Argentina, c. Coronel Sagon 2981, Valentin Alsina, Buenos Aires, Argentina.